НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНАЯ УСТАНОВА
“НАЦЫЯНАЛЬНЫ ІНСТЫТУТ АДУКАЦЫІ”
МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

# “МАСТАЦТВА ВЫЦІНАНКІ”

**Праграма факультатыўных заняткаў для 5 – 6 класаў
устаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай і рускай мовамі навучання**

# Тлумачальная запіска

Выцінанка – адзін з відаў беларускага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, які адыгрывае значную ролю ў працэссе эстэтычнага і культуразгоднага развіцця вучняў.

Выцінанка – гэта ажурны ўзор, выразаны з белай, чорнай, або каляровай паперы пры дапамозе нажніц ці нажа. Зарадзіўся гэты від дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ў Кітаі, а развіццё атрымаў у сувязі з удасканальваннем папяровай вытворчасці.

Для беларускай выцінанкі характэрны простыя кампазіцыі на аснове геаметрычных, раслінных, зааморфных і рэдка прадметных матываў. Выцінанку шырока выкарыстоўвалі ў побыце. Ёй упрыгожвалі вокны, сцены, паліцы, столь і покуць (“кут”). Кожны год выцінанку абнаўлялі, звычайна да Вялікадня. З развіццём лёгкай прамысловасці выцінанку наогул замяніў тэкстыль. Апошні перыяд росквіту выцінанкі прыпадае на першае дзесяцігоддзе пасля вайны. Потым мастацтва выцінанкі зноў было ў заняпадзе. Зараз можна назіраць аднаўленне гэтага віда беларускага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Выцінанка набыла сучаснае “гучанне”, але не згубіла і традыцыйныя рысы.

У працэсе правядзення заняткаў па выцінанцы ў вучняў развіваюцца творчыя здольнасці, фантазія, уяўленне, вобразнае мысленне. Атрыманыя мастацкія веды, сфарміраваныя ўменні эмацыянальна ўспрымаць культурна-мастацкія здабыткі нашага народа з’яўляюцца дзейснымі сродкамі патрыятычнага і духоўнага выхавання вучняў.

У аснову праграмы пакладзена знакавая сімволіка і нацыянальныя традыцыі арнаментальнага мастацтва, беларускія абрады і міфалогія.

**Мэта** факультатыўных заняткаў: фарміраванне мастацкай культуры сродкамі традыцыйнай беларускай выцінанкі.

**Задачы** факультатыўных заняткаў:

- вывучэнне і асэнсаванне нацыянальных традыцый беларускай выцінанкі;
- развіццё здольнасцей эмацыянальна ўспрымаць багацце беларускай культуры;
- развіццё мастацка-творчых здольнасцей, фарміраванне практычных уменняў і навыкаў пры рабоце над выцінанкай;
- выхаванне патрыятызму, працавітасці, добрасумленнасці.

Асноўныя **патрабаванні да метадаў выкладання**:

1. Сувязь з мастацкай культурай, народнымі традыцыямі і паўсядзённым жыццём.
2. Адзінства выхавання, навучання і творчай дзейнасці вучняў.
3. Улік узроставых асаблівасцей вучняў, спалучэнне індывідуальных і калектыўных форм работы.
4. Разнастайнасць відаў работы і матэрыялаў.
5. Чаргаванне тэарэтычных і практычных урокаў.
6. Міжпрадметныя сувязі, сувязь з іншымі відамі мастацкай дзейнасці.

Асновай выкладання курса “Мастацтва выцінанкі” з’яўляецца арганічнае адзінства вучэбнага і выхаваўчага працэса: маральнае, духоўнае, эстэтычнае і

мастацкае выхаванне павінна абапірацца на сістэматычнае засваенне вучнямі мастацкіх ведаў, практычных уменняў і навыкаў творчай дзейнасці.

Адным з паказчыкаў эфектыўнасці ўрокаў па выцінанцы з’яўляецца захапленне, зацікаўленасць вучняў і жаданне займацца народным мастацтвам. Урокі павінны забяспечваць пазітыўныя эмацыянальныя адносіны навучэнцаў да мастацкай дзейнасці.

Праграма складаецца з 8-мі раздзелаў: “Гісторыя выцінанкі”, “Асаблівасці беларускай выцінанкі”, “Кампазіцыя”, “Рапортная выцінанка”, “Цэнтрычная выцінанка”, “Сіметрычная (люстэркавая) выцінанка”, “Асіметрычная выцінанка”, “Тэматычная праца”, якія вывучаюцца на розных этапах з паступовым ускладненнем.

Заняткі можна будаваць на аснове традыцыйнай структуры (арганізацыйная, тэарэтычная, практычная, заключная часткі) ці праводзіць у нестандартнай форме: занятак-выстава, занятак -конкурс майстэрства, занятак-семінар, занятак -экскурсія і інш. На занятках можна спалучаць індывідуальныя і групавыя формы работы, даваць вучням заданні рознай ступені складанасці. Трэба шырока выкарыстоўваць наглядны матэрыял: узоры работ, фотаздымкі, ілюстрацыі. У раздзеле: “Тэматычная праца”, дзе заняткі прысвечаны святам і абрадам, для развіцця творчых здольнасцей вучняў лепш выкарыстоўваць схемы работ ці тэхналагічныя карты, а таксама самастойнае вывучэнне тэарэтычнага матэрыялу.

## 5 клас
## Першы год навучання
## Прыкладны тэматычны план

| № | Назва тэм | Колькасць гадзін |
|---|---|---|
| **1.** | **Гісторыя выцінанкі** | **1** |
| 1.1. | Паходжанне выцінанкі | 1 |
| **2.** | **Асаблівасці беларускай выцінанкі** | **1** |
| 2.1. | Сэнс адтулін, характэрны для беларускай выцінанкі | 1 |
| **3.** | **Кампазіцыя** | **8** |
| 3.1. | Кампазіцыя ў выцінанцы | 3 |
| 3.2. | Арганізацыя плоскасці, паняцце раўнавагі | 3 |
| 3.3. | Метады стылізацыі | 2 |
| **4.** | **Рапортная выцінанка** | **4** |
| 4.1. | Геаметрычныя матывы ў рапортнай выцінанцы | 2 |
| 4.2. | Раслінныя матывы ў рапортнай выцінанцы | 2 |
| **5.** | **Цэнтрычная выцінанка** | **6** |
| 5.1. | Геаметрычныя матывы ў цэнтрычнай выцінанцы | 2 |
| 5.2. | Мандала. Сімвалічны і філасофскі сэнс | 2 |
| 5.3. | Раслінныя матывы ў цэнтрычнай выцінанцы | 2 |
| **6.** | **Тэматычная праца** | **12** |
| 6.1. | Калядныя матывы ў выцінанцы | 4 |
| 6.2. | Калядныя паштоўкі | 4 |
| 6.3. | Праца на тэму “Прыйшла Каляда” | 4 |
| **7.** | **Кампазіцыя** | **2** |
| 7.1. | Сіметрычная і асіметрычная раўнавага. Раўнавага асобных элементаў кампазіцыі | 2 |
| **8.** | **Сіметрычная (люстэркавая) выцінанка** | **8** |
| 8.1. | Геаметрычныя матывы ў сіметрычнай (люстэркавай) | 4 |

| | | |
|---|---|---|
| | выцінанцы | |
| 8.2. | Раслінныя матывы ў сіметрычнай (люстэркавай) выцінанцы | 4 |
| **9.** | **Асіметрычная выцінанка** | **8** |
| 9.1. | Геаметрычныя матывы ў асіметрычнай выцінанцы | 4 |
| 9.2. | Раслінныя матывы ў асіметрычнай выцінанцы | 4 |
| **10.** | **Тэматычная праца** | **12** |
| 10.1. | Купальскія матывы ў выцінанцы | 4 |
| 10.2. | Праца на тэму “Папараць-кветка” | 4 |
| 10.3. | Праца на тэму “Купальская ноч” | 4 |
| **11.** | **Праца на вольную тэму** | **5** |
| **12.** | **Выніковая выстава вучнеўскіх работ** | **1** |
| | **Усяго гадзін:** | **68** |

## Змест

**1. Гісторыя выцінанкі (1).**

Паходжанне выцінанкі: характарыстыка выцінанкі як віда дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Гісторыя развіцця. Матэрыял для выцінанкі. Сувязь з побытам. Асноўныя віды выцінанкі і іх асаблівасці.

**2. Асаблівасці беларускай выцінанкі (1).**

Сэнс адтулін, характэрны для беларускай выцінанкі: сюжэты беларускай выцінанкі. Узоры выцінанак беларускіх майстроў сучаснасці. Паслядоўнасць выканання.

**3. Кампазіцыя (8).**

Кампазіцыя ў выцінанцы: кампазіцыя і яе асаблівасці ў выцінанцы, аналіз узораў. Выкананне практыкаванняў на вызначэнне кампазіцыі, віда.

Арганізацыя плоскасці, паняцце раўнавагі: законы кампазіцыі ў выцінанцы, размяшчэнне элементаў кампазіцыі, выкананне эскізаў выцінанак.

Метады стылізацыі: паняцце аб стылізацыі, роля стылізацыі ў выцінанцы, метады і прыемы стылізавання выяў. Практыкаванні па стылізацыі аб’ектаў навакольнага асяроддзя.

**4. Рапортная выцінанка (4).**

Геаметрычныя матывы ў рапортнай выцінанцы: паняцце аб рапортнай выцінанцы, геаметрычныя элементы, іх сімвалічнасць, кампазіцыйнае размяшчэнне.

Раслінныя матывы ў рапортнай выцінанцы: сімвалічнасць раслінных матываў, стылізацыя расліннага свету, кампазіцыйнае размяшчэнне элементаў раслінных матываў.

**5. Цэнтрычная выцінанка (6).**

Геаметрычныя матывы ў цэнтрычнай выцінанцы: паняцце цэнтра ў выцінанцы, асаблівасці цэнтрычнай выцінанкі, правільнае размяшчэнне элементаў кампазіцыі ў цэнтрычнай выцінанцы з геаметрычнымі матывамі.

Мандала. Сімвалічны і філасофскі сэнс: паняцце аб "мандале", асаблівасці яе выявы, сэнс сімвалаў, сувязь з побытам людзей, паслядоўнасць выканання.

Раслінныя матывы ў цэнтрычнай выцінанцы: правілы кампазіцыйнага размяшчэння стылізаваных элементаў раслін, восі сіметрыі, паўторы.

**6. Тэматычная праца (12).**

Калядныя матывы ў выцінанцы: сувязь выцінанкі са святамі беларусаў, іх адлюстраванне ў выцінанцы, сімвалічнасць сюжэтаў. Каляды і іх сімвалы. Стылізацыя сімвалаў Калядных святаў у выцінанцы.

Калядныя паштоўкі: элементы калядных сімвалаў у выцінанцы, іх памер і размяшчэнне, стылізацыя.

Праца на тэму "Прыйшла Каляда": калядныя сімвалы, распрацоўка эскіза, кампазіцыйнае размяшчэнне элементаў, паслядоўнасць выканання, тэхніка бяспекі пры рабоце з нажніцамі.

**7. Кампазіцыя (2).**

Сіметрычная і асіметрычная раўнавага. Раўнавага асобных элементаў кампазіцыі: паняцце сіметрыі і асіметрыі ў выцінанцы, аналіз узораў.

**8. Сіметрычная (люстэркавая) выцінанка (8).**

Геаметрычныя матывы ў сіметрычнай (люстэркавай) выцінанцы: асаблівасці размяшчэння геаметрычных элементаў у сіметрычнай выцінанцы, паслядоўнасць выканання сіметрычнай выцінанкі.

Раслінныя матывы ў сіметрычнай (люстэркавай) выцінанцы: сіметрыя ў выцінанцы з элементамі раслін, кампазіцыйныя асаблівасці выцінанкі з раслiннымі матывамі.

**9. Асіметрычная выцінанка (8).**

Геаметрычныя матывы ў асіметрычнай выцінанцы: асіметрыя ў выцінанцы з геаметрычнымі элементамі, законы кампазіцыйнага размяшчэння, паслядоўнасць выканання.

Раслінныя матывы ў асіметрычнай выцінанцы: кампазіцыя асіметрычнай выцінанкі з расліннымі матывамі, асаблівасці выканання.

**10. Тэматычная праца (12).**

Купальскія матывы ў выцінанцы: абрады свята Купалле, сімвалы свята, іх стылізацыя для выцінанкі, кампазіцыйнае размяшчэнне.

Праца на тэму "Папраць-кветка": распрацоўка эскіза, кампазіцыя, паслядоўнасць работы, работа ў матэрыяле.

Праца на тэму "Купальская ноч": стварэнне эскіза, размяшчэнне элементаў кампазіцыі, выкананне ў матэрыяле.

**11. Праца на вольную тэму (5).**

**12. Выніковая выстава вучнеўскіх работ (1).**

## Чакаемыя вынікі

К канцу пятага класа вучні павінны

**ведаць**:

- паходжанне і асаблівасці беларускай выцінанкі;
- асновы кампазіцыйнай пабудовы выцінанкі, метады стылізацыі;
- сімволіку абярэгаў, калядныя і купальскія сімвалы;

**умець**:

- будаваць кампазіцыйную схему рапортнай, цэнтрычнай, сіметрычнай і асіметрычнай выцінанкі з выкарыстаннем геаметрычных і раслінных матываў;
- выкарыстоўваць знакавую сімволіку ў тэматычных працах.

## 6 клас
## Другі год навучання
## Прыкладны тэматычны план

| № | Назва тэм | Колькасць гадзін |
|---|---|---|
| **1.** | **Гісторыя выцінанкі** | **1** |
| 1.1. | Распаўсюджванне выцінанкі як віда дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ў Еўропе і ў Беларусі | 1 |
| **2.** | **Кампазіцыя** | **1** |
| 2.1. | Паняцце рытма і непадзельнасці кампазіцыі | 1 |
| **3.** | **Асаблівасці беларускай выцінанкі** | **2** |
| 3.1. | Рытм у беларускай выцінанцы | 2 |
| **4.** | **Рапортная выцінанка** | **8** |
| 4.1. | Зааморфныя вобразы ў рапортнай выцінанцы | 4 |
| 4.2. | Антрапаморфныя вобразы ў рапортнай выцінанцы | 4 |
| **5.** | **Цэнтрычная выцінанка** | **8** |
| 5.1. | Зааморфныя вобразы ў цэнтрычнай выцінанцы | 4 |
| 5.2. | Антрапаморфныя вобразы ў цэнтрычнай выцінанцы | 4 |
| **6.** | **Тэматычная праца** | **12** |
| 6.1. | Праца на тэму “Дрэва жыцця” | 4 |
| 6.2. | Праца на тэму “Птушка шчасця” | 4 |
| 6.3. | Праца на тэму “Пяруновыя стрэлы” | 4 |
| **7.** | **Сіметрычная (люстэркавая) выцінанка** | **8** |
| 7.1. | Зааморфныя вобразы ў сіметрычнай (люстэркавай) выцінанцы | 4 |
| 7.2. | Антрапаморфныя вобразы ў сіметрычнай (люстэркавай) выцінанцы | 4 |
| **8.** | **Асіметрычная выцінанка** | **8** |
| 8.1. | Зааморфныя вобразы ў асіметрычнай | 4 |

| | | |
|---|---|---|
| | выцінанцы | |
| 8.2. | Антрапаморфныя вобразы ў асіметрычнай выцінанцы | 4 |
| **9.** | **Тэматычная праца** | **12** |
| 9.1. | Праца на тэму “Зажынкі” | 4 |
| 9.2. | Праца на тэму “Хлябок” | 4 |
| 9.3. | Праца на тэму жніўеньскіх прыказак і прымавак | 4 |
| **10.** | **Праца на вольную тэму** | **7** |
| **11.** | **Выніковая выстава вучнеўскіх работ** | **1** |
| | **Усяго гадзін:** | **68** |

## Змест

**1. Гісторыя выцінанкі (1).**

Распаўсюджванне выцінанкі як віда дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ў Еўропе і ў Беларусі: развіцце выцінанкі ў Еўропе, сувязь з папяровай вытворчасцю, майстры выцінанкі Еўропы і Беларусі.

**2. Кампазіцыя (1).**

Паняцце рытма і непадзельнасці кампазіцыі: рытм у кампазіцыі, асаблівасці рытма у выцінанцы, кампазіцыйная ідэя і сэнс.

**3. Асаблівасці беларускай выцінанкі (2).**

Рытм у беларускай выцінанцы: адметнасці беларускай выцінанкі, вобразы (зааморфныя і антрапаморфныя) у беларускай выцінанцы, асаблівасці выканання.

**4. Рапортная выцінанка (8).**

Зааморфныя вобразы ў рапортнай выцінанцы: сімвалічнасць зааморфных вобразаў, стылізацыя зааморфных вобразаў, кампазіцыйнае размяшчэнне, паслядоўнасць выканання.

Антрапаморфныя вобразы ў рапортнай выцінанцы: значэнне выяў чалавека ў выцінанцы, кампазіцыя антрапаморфных вобразаў у рапортнай выцінанцы, асаблівасці выканання.

**5. Цэнтрычная выцінанка (8).**

Зааморфныя вобразы ў цэнтрычнай выцінанцы: правілы размяшчэння зааморфных вобразаў у цэнтрычнай выцінанцы, рытм і паўторы выяў, паслядоўнасць выканання.

Антрапаморфныя вобразы ў цэнтрычнай выцінанцы: вобразы чалавека ў цэнтрычнай выцінанцы, сімвалічнасць вобразаў, іх кампазіцыйнае размяшчэнне, этапы выканання.

**6. Тэматычная праца (12).**

Праца на тэму "Дрэва жыцця": сімвалічнасць вобраза "дрэва жыцця", кампазіцыйны аналіз узораў, састаўленне эскіза, выкананне ў матэрыяле.

Праца на тэму "Птушка шчасця": сэнс вобраза птушкі ў беларускай міфалогіі, "птушка шчасця" у выцінанках беларускіх майстроў, распрацоўка эскіза, работа ў матэрыяле.

Праца на тэму "Пяруновыя стрэлы": бог Пярун у беларускай міфалогіі, стылізацыя агню, кампазіцыйнае размяшчэнне элементаў распрацаванага эскіза, паслядоўнасць выканання ў матэрыяле.

**7. Сіметрычная (люстэркавая) выцінанка (8).**

Зааморфныя вобразы ў сіметрычнай (люстэркавай) выцінанцы: стылізацыя зааморфных вобразаў для сіметрычнай выцінанкі, асаблівасці размяшчэння зааморфных вобразаў у сіметрычнай выцінанцы, рытм і восі сіметрыі, этапы выканання сіметрычнай выцінанкі.

Антрапаморфныя вобразы ў сіметрычнай (люстэркавай) выцінанцы: кампазіцыя ў сіметрычнай выцінанцы з антрапаморфнымі вобразамі, паслядоўнасць выканання.

**8. Асіметрычная выцінанка (8).**

Зааморфныя вобразы ў асіметрычнай выцінанцы: асіметрыя пры распрацоўцы выцінанкі з зааморфнымі вобразамі, кампазіцыйная ідэя, стылізацыя вобразаў, паслядоўнасць работы.

Антрапаморфныя вобразы ў асіметрычнай выцінанцы: сімвалічнасць антрапаморфных вобразаў, стылізацыя зместу асіметрычнай выцінанкі з антрапаморфнымі вобразамі, кампазіцыйнае размяшчэнне, паслядоўнасць выканання ў матэрыяле.

**9. Тэматычная праца (12).**

Праца на тэму "Зажынкі": сімвалічнасць свята, абрадавыя асаблівасці, стылізацыя элементаў, кампазіцыйнае размяшчэнне, распрацоўка эскіза, выкананне ў матэрыяле.

Праца на тэму "Хлябок": абрады і вобразы свята, кампазіцыйнае рашэнне выцінанкі, распрацоўка эскіза, паслядоўнасць работы ў матэрыяле.

Праца на тэму жнівеньскіх прыказак і прымавак: прыклады беларускіх прымавак і прыказак пра збор ураджаю, вобраз хлеба, распрацоўка эскіза, кампазіцыйнае размяшчэнне, работа ў матэрыяле.

**10. Праца на вольную тэму (7).**

**11. Выніковая выстава вучнеўскіх работ (1).**

## Чакаемыя вынікі

К канцу шостага класа вучні павінны

**ведаць**:

- адметныя рысы еўрапейскай і беларускай выцінанкі;
- аб рытме ў выцінанцы;
- сімволіку беларускіх святаў;

**умець**:

- будаваць схемы выцінанкі з улікам рытму і непадзельнасці кампазіцыі;
- выкарыстоўваць зааморфныя і антрапаморфныя вобразы.

# Прапануемая літаратура


1. Беларуская міфалогія: энцыклапед. слоўн. / Склад. І. Клімковіч. 2-е выд. – Мн., 2006.
2. Беларускі фальклор: энцыклапедыя. У 2 т. – Мн., 2005 – 2006.
3. Беларуская міфалогія. Уклад. У.А. Васілевіч. 2-е выд. – Мн., 2002.
4. Гісторыя беларускага мастацтва: у 6 т. Т. 3. – Мн., 1989.
5. Дрэва кахання: легенды, паданні, сказы. / Склад. А.І. Гурскі. – Мн., 1980.
6. Канаш В.П. Выхаваўчая работа ў школе на аснове каляндарнай абраднасці беларусаў. – Мн., 1995.
7. Кацар М.С. Беларускі арнамент. – Мн., 1989.
8. Коваль У.І., Новак В.С. Беларускія народныя святы і звычаі. – Гомель, 1993.
9. Крук Я. Сімволіка беларускай народнай культуры. – Мн., 2003.
10. Кухаронак Т.І. Маскі ў каляндарнай абраднасці беларусаў. – Мн., 2001.
11. Ліцьвінка В. Святы і абрады беларусаў. – Мн., 1998.
12. Народная культура Беларусі: энцыкл. давед. / Пад агульн. рэд. В.С. Цітова. – Мн., 2002.
13. Сахута Я.М. Народнае мастацтва Беларусі. – Мн., 1977.
14. Сахута Я.М. Беларускае народнае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. – Мн., 1996.
15. Сахута Я.М. Вечназялёнае дрэва рамёстваў. – Мн., 1997.
16. Сахута Я.М. Народныя мастацкія рамёствы Беларусі. . – Мн., 2001.
17. Сысоў У.М. З крыніц спрадвечных. – Мн., 1997.
18. Шамак А,А, Міфалогія беларусаў. – Мн., 2004.
19. Шамякіна Т.І. Міфалогія Беларусі. – Мн., 2006.